Для взрослого человека основным критерием позитивной динамики в жизни становится ощущение собственного успеха. Успех может пониматься объективно и субъективно, может относиться к разным сферам самоактуализации человека. Предложенные варианты ответа можно сгруппировать в несколько основных поведенческих стратегий:

1) достижение успеха через труд. Успех зависит от собственных усилий человека. Эту стратегию описывают варианты 1, 4, частично – 3;

2) успех при помощи другого человека. Описание ситуации, в которой другой человек сыграл главную роль в достижении успеха. Эту стратегию описывают варианты 2, 8 и 9;

3) успех как стечение обстоятельств, результат более высокой одаренности от природы. Эту стратегию описывают варианты 5 и 6;

4) успех как свидетельство наличия определенных негативный качеств: «ловкачества», беспринципности, подхалимажа, «умения крутиться». Эту стратегию описывают варианты 7 и 9.

Важное значение в понимании системы ценностей, притязаний, а, следовательно, и социального самочувствия и духовной культуры студентов, имеет изучение идеала человека. Идеал, с точки зрения философии, – это «высшая **ценность**; наилучшее, завершенное состояние того или иного **явления**; образец личных качеств, способностей; высшая **норма** нравственной **личности**». От того, кого молодежь называет своим идеалом, зависит и ее стратегия выбора цели, выражаются ее жизненные приоритеты и ценности.

Более половины респондентов указали, что идеалом для них является близкий честный, добрый, открытый человек, многие дополняли этот ответ, указывая, что этим близким добрым человеком является кто-то из их родителей, бабушка или дедушка, школьный учитель, преподаватель вуза или тренер. В тоже время, вероятно, имея в виду библейскую заповедь «не сотвори себе кумира», каждый пятый респондент указал, что никто и никогда не станет для них кумиром. 3-5 позицию занимают «преуспевающий бизнесмен» (18%), «эрудированный интеллектуал» (16%), «знаменитый спортсмен» (13%). Наиболее существенные отличия в выборе в зависимости от пола респондента наблюдаются в таких вариантах ответов, как «знаменитый спортсмен»: его идеалом готовы назвать 21% юношей и только 9% девушек. Девушки также в два раза чаще выбирали в качестве идеала «звезду эстрады», хотя в целом количество выборов этого варианта невелико: 8% среди девушек и 4% среди юношей.

**Заключение.** Проведенное исследование свидетельствует, что на первом месте среди факторов жизненного успеха в представлении студентов ВГУ находится вариант «умение упорно трудиться, личная инициатива», что свидетельствует о том, что студенты верят в себя, готовы трудиться для достижения успеха, проявлять инициативу. Однако около 30% выбрали вариант «везение». Этот выбор свидетельствует о неверии в свои силы, пассивности, безынициативности, стремлении «ждать у моря погоды».

Также определенную тревогу вызывает тот факт, что в среднем респонденты в два раза чаще называют своим идеалом преуспевающего бизнесмена или знаменитого предпринимателя, чем известного ученого или известного политика. Это свидетельствует о сильном влиянии современных рыночных отношений на мировоззрение студенческой молодежи, и высоком значении критерия богатства, материального благополучия в представлении о жизненном успехе.

Таким образом, представление о факторах жизненного успеха и идеалах молодежи, качество и степень выраженности каждого из этих элементов определяют уровень нравственного, эстетического, интеллектуального, а в итоге – культурного развития любого общества.

## ПАТРЫЁТКА, ДАСЛЕДЧЫЦА, ПЕДАГОГ: ПАМЯЦІ НІНЫ ІВАНАЎНЫ ДАРАФЕЕНКА

*А.М. Дулаў*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Жыццё Ніны Іванаўны Дарафеенка (1923–2015) можна без перабольшання назваць подзвігам. Адданая патрыётка, удзельніца антыфашысцкага супраціўлення, пасля Вялікай Айчыннай вайны яна стала даследчыцай Віцебскага падполля. Доўгі час Ніна Іванаўна вучыла і выхоўвала студэнтаў, прычым не толькі словам, але і асабістым прыкладам. Мэта работы: акрэсліць асноўныя вехі жыцця, навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці Н.І. Дарафеенка.



Репозиторий ВГУ

**Матэрыял і метады.** Былі скарыстаны ўспаміны Н.І. Дарафеенка пра ваенныя гады [1; 2], аўдыёзапіс інтэрв'ю з Нінай Іванаўнай ад 12 мая 2009 г. [3], нарыс В. Шалухі, напісаны ў значнай ступені з уласных уражанняў аўтара ад супрацоўніцтва і сяброўства з гераіняй [4], біяграфічныя звесткі з "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" і кніг "Памяць" Віцебска і Віцебскага раёна, а таксама асноўныя навуковыя работы даследчыцы. Прыменены метад інтэрв'ю, агульналагічныя, гісторыка-генетычны і біяграфічны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ніна Іванаўна Дарафеенка (дзявочае прозвішча – Маісеева) нарадзілася 10 студзеня 1923 г. у вёсцы Уласава непадалёк ад Суража ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы ў Суражы Ніна Іванаўна навучалася ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце, закончыла педагагічныя курсы пры Віцебскім педагагічным інстытуце [3].

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны Ніна Іванаўна вярнулася ў родную вёску, уключылася ў антыфашысцкі рух, стала ўдзельніцай падпольнай групы Ф.М. Іванова. Падпольшчыкі збіралі зброю, займаліся агітацыяй, перашкаджалі акупантам у зборы прадуктаў харчавання і фуражу, здабывалі разведдадзеныя для партызан.

У красавіку 1942 г. мужчыны вёсак Стукальна і Уласава (каля 30-ці чалавек) арганізавана пайшлі ў партызанскі атрад «Крэпасць». Ф.М. Іваноў неўзабаве стаў камісарам атрада. Дзяўчаты-падпольшчыцы ўтварылі пярвічную камсамольскую арганізацыю, сакратаром якой была абрана Ніна Маісеева. Арганізацыя супрацоўнічала з партызанамі, а потым і з армейскімі разведчыкамі. Дзяўчаты займаліся, галоўным чынам, разведкай, здабывалі дадзеныя пра нямецкі гарнізон у Суражы. Хадзіла ў Сураж і Ніна Іванаўна, якая падвяргала сябе смяротнай небяспецы: за ёй «вялося паляванне», двойчы замест яе арыштоўвалі стрыечную сястру. У лістападзе 1942 г. удзельніцы арганізацыі сталі партызанкамі брыгады «Аляксея», дзе прадоўжылі змагацца з акупантамі [1, арк. 3; 2, с. 2; 3]. За праяўленыя мужнасць і гераізм Ніна Іванаўна была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі» і «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

У гады вайны Ніна Іванаўна страціла сям'ю. Ёй самой цудам удалося выжыць. Вярнулася дадому з хворымі нагамі і моцна сапсаваным зрокам. Пасля вызвалення Суражчыны, як толькі дазволіла здароўе, пайшла працаваць настаўніцай. Ніна Іванаўна займалася камсамольскай працай, была абрана другім сакратаром райкама камсамола. Адчуваючы недахоп ведаў, у 1946 г. яна стала студэнткай завочнага аддзялення гістарычнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута. Менавіта падчас вучобы ў Віцебску Ніна Іванаўна зрабіла першы крок да вывучэння антыфашысцкай барацьбы: напісала кантрольную работу пра змаганне ў шэрагах партызан [3].

Пасля заканчэння двух курсаў Віцебскага педінстытута Ніна Іванаўна пераехала ў Молатаў (Перм), дзе жыў яе дзядзька, закончыла гістарычны факультэт Пермскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. У 1949 г. вярнулася на радзіму, працавала інспектарам Віцебскага аблана, інструктарам Віцебскага абкама партыі, загадчыкам кабінета грамадскіх навук Віцебскага медінстытута. Выйшла замуж за франтавіка, журналіста Мікалая Уладзіміравіча Дарафеенку. У 1956 г., ужо будучы маці дваіх дзяцей, Н.І. Дарафеенка закончыла Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС, стала працаваць выкладчыцай на палову стаўкі.

Аднак вольнай стаўкі ў медінстытуце не было, і калі вызвалілася месца ў ВДПІ імя С.М. Кірава, Ніна Іванаўна перайшла туды. З 1962 па 1980 г. яна працавала на кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі, выкладала гісторыю партыі на матэматычным і біялагічным факультэтах. Да сваёй працы Н.І. Дарафеенка падыходзіла творча, шчыра, з душою. Яна была выкладчыцай патрабавальнай, строгай, але справядлівай, дзякуючы чаму карысталася аўтарытэтам і павагай як сярод студэнтаў, так і сваіх калег. У 1978 г. Ніне Іванаўне было прысвоена званне «Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР».

Сферай навуковых інтарэсаў Ніны Іванаўны стаў антыфашысцкі рух супраціву. Даследаванне дадзенай тэмы яна лічыла сваім асабістым абавязкам. Пасля прыходу ў ВДПІ імя С.М. Кірава Н.І. Дарафеенка пачала працу над кандыдацкай дысертацыяй, прысвечанай гісторыі падпольнай барацьбы ў Віцебску. Каб абарона дысертацыі стала магчымай, павінна была завяршыцца работа па зацвярджэнні ЦК КПБ складу віцебскага падполля. Ніна Іванаўна і Мікалай Уладзіміравіч Дарафеенкі ўвайшлі ў камісію абкама КПБ па вывучэнні і прызнанні віцебскага падполля, якую ўзначальваў сакратар па прапагандзе, журналіст і гісторык Мікалай Ільіч Пахомаў [3]. Менавіта яны выканалі асноўную работу па падрыхтоўцы даведкі, тэкст якой быў надрукаваны цалкам у газетах «Звязда» і «Советская Белоруссия» [5].

Репозиторий ВГУ

У 1968 г. Н.І. Дарафеенка паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па гісторыі віцебскага падполля. У аснову даследавання была пакладзена грунтоўная база крыніц. Даследчыца выкарыстала архіўныя матэрыялы, у тым ліку трафейныя дакументы, а таксама ўспаміны саміх падпольшчыкаў іх родных і блізкіх, якія пісаліся людзьмі па просьбе Ніны Іванаўны ці запісваліся ёю (фактычна прымяняўся метад «вуснай гісторыі»). Разам з Мікалаем Уладзіміравічам яны правялі вялікую пошукавую работу, абыйшлі пешшу Віцебск, наведалі навакольныя гарады і вёскі, каб сустрэцца з удзельнікамі і відавочцамі падзей. Па словах В. Шалухі, кватэра Дарафеенкаў «стала штабам пошуку. Увесь горад прыйшоў на дапамогу Ніне Іванаўне. У кватэры заўсёды было шмат наведвальнікаў, тут адбываліся цікавыя сустрэчы, не змаўкаў тэлефон, паштальён часта прыносіў стосы пісем і тэлеграм» [4, с. 17].

У 1969 г. убачыла свет падрыхтаваная Нінай Іванаўнай на аснове дысертацыі разам з М.У. Дарафеенкам і М.І. Пахомавым кніга «Витебское подполье», якая атрымала высокую ацэнку спецыялістаў і выклікала вялікую зацікаўленасць у чытачоў. У 1974 г. выйшла другое, перапрацаванае і дапоўненае выданне [6]. Урыўкі друкаваліся ў перакладзе на нямецкую мову ў газеце «NEUER TAG» («Новы дзень») Франкфурта-на-Одэры (ГДР). Кніга стала сапраўднай данінай памяці подзвігу патрыётаў Айчыны. У ёй былі названы імёны больш за тысячу змагароў з нацызмам. Чытачы змаглі даведацца пра акупацыйны рэжым у Віцебску, становішча насельніцтва, гераізм падпольшчыкаў, асноўныя формы і метады іх змагання, значныя паспяховыя аперацыі (забойства рэдактара газеты «Новый путь» А.Л. Бранта, арганізацыя пераходу на бок партызан 825-га батальёна Волга-татарскага легіёна і інш.). Аўтары паказалі ўсенародны характар барацьбы з акупантамі, у якой удзельнічалі жыхары Віцебска розных узроставых груп (ад дзяцей да старых), замежныя антыфашысты (П. Кёрнер-Шрадэр (К. Шрадэр), І. Лойда). Асобны раздзел быў прысвечаны дзейнасці ў акупаваным Віцебску Веры Харужай. Матэрыялы кнігі разам з больш познімі публікацыямі Ніны Іванаўны сталі асновай для стварэння навуковай канцэпцыі ўнікальнай «Экспазіцыі памяці патрыётаў Віцебшчыны» Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, адчыненай у былых засценках турмы СД на Успенскай горцы, і распрацоўкі экскурсу.

Важным накірункам навуковай дзейнасці Ніны Іванаўны было даследаванне подзвігу В.З. Харужай у акупаваным Віцебску. Першы артыкул па гэтай тэме быў апублікаваны даследчыцай яшчэ ў 1967 г. Падчас распрацоўкі праблемы Н.І. Дарафеенка дэталёва высветліла абставіны дзейнасці ў Віцебску легендарнай падпольшчыцы і яе гібелі, пераканаўча даказала, што Вера Захараўна стварыла і ўзначаліла ўвосень 1942 г. у горадзе не групу, а падпольны партыйны цэнтр, што дазваляе ў поўнай меры асэнсаваць маштаб яе ўкладу ў антыфашысцкую барацьбу [7–9]. Ролі В.З. Харужай у дзейнасці віцебскага падполля быў прысвечаны і апошні артыкул даследчыцы [10].

Ніна Іванаўна выступіла ініцыятарам распрацоўкі праблемы ўдзелу дзяцей Віцебшчыны ў барацьбе супраць нацысцкіх акупантаў. Кніга «Юные герои Витебщины», уступнае слова да якой напісаў В. Быкаў, была падрыхтавана сумесна з калегамі і з дапамогай студэнтаў. Тэкст, які складаецца з невялікіх нарысаў, утрымлівае звесткі пра больш за 120 юных змагароў [11]. Кніга знайшла зацікаўленых чытачоў, выкарыстоўвалася ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Н.І. Дарафеенка стала аўтарам артыкулаў, прысвечаных віцебскаму патрыятычнаму падполлю, у энцыклапедычных выданнях, у гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць» г. Віцебска [8; 12]. Даследчыца абнародавала факты, звязаныя з паводзінамі партыйных кіраўнікоў – сакратара віцебскага гаркама КП(б)Б П.І. Іванова і сакратара Беластоцкага абкама партыі П.І. Папова, якія былі пакінуты ў пачатку вайны ў Віцебску для кіраўніцтва падпольным партыйным цэнтрам, але збеглі з горада, у выніку чаго камуністы-падпольшчыкі засталіся без дакументаў, ім былі невядомыя многія канспіратыўныя кватэры, шмат часу было згублена на пошукі кіраўнікоў. Многія падпольныя групы ў першы год акупацыі былі створаны патрыётамі самастойна [7, с. 80–81].

Ніна Іванаўна вылучыла ў дзейнасці віцебскага падполля два этапы: першы – ад пачатку акупацыі горада да адкрыцця Віцебскіх (Суражскіх) «варот» у лютым 1942 г., другі – з лютага 1942 г. да канца чэрвеня 1944 г., да вызвалення; ахарактарызавала гэтыя этапы, паказала складанасць барацьбы ва ўмовах прыфрантавога горада. Агульнапрызнаныя ў гістарыяграфіі абагульненыя лічбы, прыведзеныя даследчыцай: у перыяд акупацыі ў Віцебску дзейнічалі 66 падпольных груп, каля 1500 падпольшчыкаў [12].



Репозиторий ВГУ

Шмат намаганняў прыклала Н.І. Дарафеенка дзеля таго, каб у Віцебску былі адкрыты помнікі і мемарыяльныя дошкі падпольшчыкам. Да апошніх дзён жыцця Ніна Іванаўна захоўвала вернасць ідэалам маладосці, займала прынцыповую і актыўную грамадзянскую пазіцыю.

**Заключэнне.** Такім чынам, справай жыцця Н.І. Дарафеенка сталі адкрыццё праўды і ўшанаванне памяці пра подзвіг віцебскіх падпольшчыкаў. Даследчыца выявіла імёны многіх змагароў з нацызмам, не толькі захавала іх для гісторыі, але ў шэрагу выпадкаў аднавіла праўду пра герояў. Працы Ніны Іванаўны не згубілі актуальнасці і навуковай значнасці. У гэтай сувязі ўяўляецца неабходным перавыданне навуковай спадчыны гісторыка.


Спіс літаратуры

1. Дорофеенко, Н. И. Вспоминая 1941-й ... (Машинопись) / Н. И. Дорофеенко // Музей гісторыі ВДУ імя П.М. Машэрава, фонды.
2. Дорофеенко, Н. И. По зову сердца / Н. И. Дорофеенко // Медвузовец. – 2008. – май. – С. 1–2.
3. Інтэрв'ю з Дарафеенка Нінай Іванаўнай, 1923 г.н. ад 12.05.2009 г. Аўдыёзапіс // Асабісты архіў аўтара.
4. Шалуха, В. Праз усё жыццё / В. Шалуха // Народная асвета. – 1979. – № 3. – С. 16–18.
5. Горад мужных, нескароных: Аб партыйным патрыятычным падполлі ў Віцебску ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 г. – чэрвень 1944 г.) / Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ – філіял Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС; Віцебскі абком КПБ. – Звязда. – 1967. – 5 ліпеня. – С. 2–4.
6. Пахомов, Н. И. Витебское подполье. 2-е изд., перераб. и доп. / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко – Минск: Беларусь, 1974. – 248 с.
7. Дарафеенка, Н. І. Аб кіруючым падпольным цэнтры ў Віцебску (1941 – 1943). Новы погляд на абставіны падпольнай дзейнасці В. З. Харужай / Н. І. Дарафеенка // Война известная и неизвестная: Материалы науч.-практ. конф., посвящ. 50-летию освобождения Витебщины от немецко-фашистских захватчиков, 15–16 июня 1994 г. – Витебск: Витебский областной краеведческий музей, 1995. – С. 80–88.
8. Дарафеенка, Н. І. Подзвіг Веры Харужай у Віцебску / Н. І. Дарафеенка // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1-я / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 471–478.
9. Дарафеенка, Н. І. Аб Веры Харужай – новае слова / Н. І. Дарафеенка // Віцебшчына ў 1941 – 1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 18 – 19 чэрвеня 2009 г. / Віц. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава". – С. 110–117.
10. Дарафеенка Н. І. У адпаведнасці з праўдай гісторыі: Роля В.З. Харужай у дзейнасці Віцебскага падполля / Н. І. Дарафеенка, А. М. Дулаў // Беларуская думка. – 2011. – № 6. – С. 21–25.
11. Юные герои Витебщины / Н. И. Дорофеенко, В. Г. Скопа, Т. И. Глинка, Г. М. Акентьев. – Минск: Нар. асвета, 1980. – 127 с.
12. Дарафеенка, Н. І. Віцебскае падполле дзейнічае / Н. І. Дарафеенка // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1-я / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 456–464.


## О НЕКОТОРЫХ ОСОБЕННОСТЯХ ВЛИЯНИЯ ИСКУССТВА НА СОЦИАЛЬНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНУЮ СФЕРУ (ИСТОРИЧЕСКАЯ РЕТРОСПЕКТИВА)


*И.В. Ермольчик*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


На протяжении последних десятилетий в отечественной педагогической науке всё большую актуальность приобретает новое практико-ориентированное направление на пересечение педагогики и искусства, получившее название «арт-педагогика». Согласно работам доктора педагогических наук Н.Ю. Сергеевой, предмет арт-педагогики можно определить как «становление человека средствами искусства в образовательном пространстве» [3, 246]. Чтобы симбиоз двух областей знаний был наиболее эффективен для образовательного процесса современной школы, необходимо обратиться к предыстории использования средств искусства для решения педагогических задач.

Цель работы – выявить характер использования средств искусства в социально-образовательной сфере на территории современной России и Беларуси до начала XX века.

**Материал и методы**. Материалом исследования послужили работы ученых и практиков Н.Ю. Сергеевой, Н.А. Дмитриева, И.Л. Вишневской, А.В. Луначарского, Р. Штейнера, Б.А. Рыбакова, представленные в научных изданиях «Краткая история искусства», «Об искусстве», «Общее учение о человеке как основа педагогики». Для достижения поставленной цели мы руководствовались теоретическими методами исследования (провели анализ исторической, педагогической и искусствоведческой литературы по теме исследования, использовали логико-дедуктивный метод).

**Результаты и их обсуждение**. Как известно, наши предки, жившие на Руси до 988 года – года принятия Христианства – были язычниками. Они обожествляли природу и стремились войти в контакт с её могущественными силами. Скудные сведения о характере языческого воспитания древних славян не позволяют сделать достоверные выводы о практике использования

Репозиторий ВГУ